*УДК 347.633.05(3)*

# УСЫНАЎЛЕННЕ Ў СТАРАЖЫТНЫМ РЫМЕ, ВІЗАНТЫІ І СЯРЭДНЯВЕЧНАЙ ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ: ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ

**Я. А. Гурынаў**

*Фонд развіцця і падтрымкі арменазнаўчых даследванняў "Анів",*
*вул. Архітэктара Уласава, д. 55, 117393, Масква, Расія,*
*gurinoveugene@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца развіццё інстытута ўсынаўлення ў Антычнасці і Сярэднявеччы. У Старажытным Рыме існавалі два асноўныя віды ўсынаўлення: adoptio і adrogatio. У часы Імперыі пачаўся працэс іх зліцця ў адзін, які канчаткова завяршыўся ў Візантыі. У сярэднявечнай Заходняй Еўропе падзел на adoptio і adrogatio фармальна захоўваўся, хоць адрозненні паміж імі, ў параўнанні са Старажытным Рымам, зрабіліся нязначнымі.

У Старажытным Рыме інстытут усынаўлення юрыдычна замацоўваў пераход прыёмнага сына або дачкі з-пад бацькоўскай улады (patria potestas) натуральнага бацькі пад уладу прыёмнага бацькі. У Візантыі і ў сярэднявечнай Заходняй Еўропе ўсынаўленне стварала паміж усынавіцелем і ўсыноўленым асабістыя сувязі накшталт тых, якія існавалі паміж бацькам і ягонымі кроўнымі дзецьмі.

**Ключавыя словы**: усынаўленне; сям'я; рымскае права; кагнатычная роднасць; агнатычная роднасць; спадчыннае права

# ADOPTION IN ANCIENT ROME, BYZANTINE, AND MEDIEVAL WESTERN EUROPE: A COMPARATIVE STUDY

**Yauhen A. Hurynau**

*"Aniv" Foundation for Development and Support of Armenian Studies,*
*Arkhitektora Vlasova str. 55, 117393, Moscow, Russia,*
*gurinoveugene@gmail.com*

The present article considers the development of the social institute of adoption during Antiquity and the Middle Ages. In Ancient Rome, there were two main types of adoption: *adoptio* and *adrogatio*. The merge of these two types into a single one begun in the Roman Empire and finally completed in the Byzantium, while in Western Europe the division into *adoptio* and *adrogatio* formally remained in force, although the differences between the two types were insignificant, when compared to Ancient Rome. In the Roman World adoption legally entrenched a transfer of an adopted child from his/her natural father's authority (*patria potestas*) under authority of an adopting father. In the Byzantine Empire as well as in Medieval Western Europe adoption established the personal ties, similar to those existing between natural parent and natural child, between adopter and adoptee.

**Keywords**: adoption; family; Roman law; cognatic kinship; agnatic kinship; inheritance

У самым агульным сэнсе ўсынаўленне – гэта стварэнне паміж чужымі людзьмі адносін, ідэнтычных тым, якія існуюць паміж

узыходзячымі і сыходзячымі сваякамі па паходжанні. У нашым даследванні разглядаецца інстытут усынаўлення ў Старажытным Рыме, Візантыі і на сярэднявечным Захадзе па наступных параметрах: роля ў грамадскім жыцці; віды ўсынаўлення; катэгорыі ўсынавіцеляў і тых, каго ўсынаўляюць; цырыманіял; прававыя наступствы. Асноўная ўвага надаецца юрыдычна-прававым аспектам.

**Старажытны Рым**

Першакрыніцы дазваляюць упэўненна прасачыць развіццё інстытута ўсынаўлення пачынаючы з эпохі Позняй Рэспублікі [1, с. 199–202; 2]. У ягонай аснове ляжала прававая фікцыя: той, каго ўсынаўлялі, прызначаўся на ролю законнага сыходзячага сваяка, народжанага ўсынавіцелем або ягоным сыходзячым сваяком [3]. Рымляне звярталіся да ўсынаўлення з мэтай павялічыць уплыў сям’і ў грамадстве, захаваць сямейную маёмасць, сямейны культ, сам род і ягонае радавое імя.

Найбольшае распаўсюджанне набылі два віды ўсынаўлення: *adrogatio* (або *arrogatio*) і *adoptio*[1]. Пры *adrogatio* ўсынавіцель і той, каго ўсынаўлялі, абодва павінны былі быць дарослымі дзеяздольнымі людзьмі (*personae sui iuris*). Першапачаткова забаранялася ўсынаўляць праз *adrogatio* хлопычкаў і жанчын, таму што ім не дазвалялася з’яўляцца ў курыятных каміцыях. Аднак пазней гэтыя забароны былі знятыя, адпаведна, Антанінам Піем (138–161) і Дыяклетыянам (284–305). Пры *adoptio* той, каго ўсынаўлялі (у статусе *persona alieni iuris*), пераходзіў з-пад улады аднаго *paterfamilias* пад уладу другога. Праз *adoptio* дазвалялася не толькі ўсынаўляць, але і ўдачараць, хоць апошняе адбывалася радзей: першы бясспрэчны выпадак удачарэнне адносіцца да II ст. н. э.

Усынаўленне павінна было адпавядаць нармалёваму парадку рэчаў: той, хто ўсынаўляў, павінен быў быць тэарэтычна здольным спарадзіць дзяцей. Па гэтай прычыне дазвалялася ўсынаўляць еўнухам-*spadones*, але не *castrati*[2]. Жанчыны не маглі ўсынаўляць, таму што не з’яўляліся носьбітамі *patria potestas* і часта не належылі да *familia* свайго мужа і дзяцей. У выключных выпадках мацярам, якія страцілі ўсіх дзяцей, дазвалялася ўсынаўляць праз *adoptio* «для суцяшэння».

Розніца ва ўзросце паміж усынавіцелем і ўсынаўляемым павінна была складаць самае малое 18 год. На прыёмных дзяцей распаўсюджваліся тыя ж абмежаванні, што і на кроўных, – напрыклад,

---

[1] Пытанне аб *adoptio per testamentum* у нашай працы свядома не разглядаецца як другаснае. Падрабязней гл.: [2, р. 78–86].

[2] У дадзеным выпадку *spado* абазначае імпатэнта, які не падвяргаўся працэдуры кастрацыі, а *castratus* — мужчыну, які прайшоў праз такую працэдуру. Падрабязней гл.: [4].

забарона браць шлюб з сіблінгамі з прыёмнай сям'і. Але калі прыёмны бацька эманцыпіраваў дзіцёнка, якога раней усынавіў, гэтыя абмежаванні здымаліся.

Усынаўленне праз *adrogatio* праводзілася ў курыятных каміцыях і патрабавала папярэдняга ўхвалення калегіі пантыфікаў. У пачатку цырымоніі ва ўсынавіцеля і прыёмнага дзіцёнка пыталіся згоды на ўсынаўленне. Потым у квіратаў прасілі, каб той, каго ўсынаўляюць, цяпер лічыўся сынам усынавіцеля «згодна з правам і законам, як калі б ён быў народжаны гэтым бацькам і гэтай маці сямейства» (Gell. V, 19). Пасля гэтага народны сход выдаваў закон, згодна з якім усыноўлены лічыўся сынам усынавіцеля. У часы Дыяклетыяна цырымонія *adrogatio* спрасцілася і ўсынаўленне пачало праводзіцца па загаду імператара (*per rescriptum principis*).

Усынаўленне праз *adoptio* праводзілася перад магістратам: прэтарам у Рыме, праконсулам або легатам у правінцыі. Той, каго ўсынаўлялі, вызваляўся з-пад улады *paterfamilias* праз трайную манцыпацыю, а потым ягоны родны бацька набываў яго ўжо як асобу *in mancipio*. Пасля гэтага ўсынавіцель выклікаў бацьку ў суд і выступаў с пазовам да яго, патрабуючы вярнуць сына. Падчас уяўнай судовай спрэчкі ўсынавіцель заяўляў пра свае бацькоўскія правы на сына, а родны бацька апошняга не супярэчыў яму; на гэтай падставе прэтар прызнаваў усыноўленага асобай, якая знаходзіцца пад *patria potestas* усынавіцеля.

У абодвух выпадках пасля адпаведнай цырымоніі ўсынаўляемы рабіўся чальцом новай *familia* і пераходзіў пад уладу ейнага *paterfamilias* ва ўсіх заканадаўчых аспектах. Пры *adrogatio* пад уладу *paterfamilias* пераходзілі таксама маёмасць і *familia* усыноўленага, то бок ягоныя дзеці рабіліся ўнукамі ўсынавіцеля. Абавязкі па пазыках не пераходзілі да ўсынавіцеля, але прэтарскае заканадаўства дазваляла крэдыторам выступаць са спецыяльным фіктыўным пазовам да ўсыноўленага.

Пры вырашэнні пытання аб атрыманні спадчыны мела значэнне тое, у якім статусе ўсыноўлены знаходзіўся ў адносінах да свайго прыёмнага і натуральнага бацькі на момант смерці першага або другога[3]. Усынаўленне ўключала прыёмнае дзіця ў катэгорыю *sui heredes*, то бок, калі бацька сямейства паміраў без тэстаменту (*ab intestato*), ягоны прыёмны сын мог прэтэндаваць на спадчыну нароўні з кроўнымі дзецьмі нябожчыка. Адначасова эманцыпацыя асобы, якую ўсынаўлялі, ейным

[3] Паколькі мы абмежаваныя фарматам артыкула, тут разглядаюцца толькі тыя найбольш распаўсюджанныя ў старажытнарымскай юрыдычнай практыцы выпадкі, калі спадчынадаўца паміраў без тэстаменту. Па пытанню аб атрыманні спадчыны ўсыноўленым падрабязней гл.: [9, p. 97–122].

роднымбацькам разрывала агнатычныя сувязі паміж імі: усыноўлены рабіўся чужым свайму роднаму бацьку і губляў права наследаваць яму. У далейшым прэтарскае заканадаўства дазволіла ўсыноўленаму наследаваць пасля смерці кроўнага бацькі ў трэццім класе наследавання, то бок у ліку непаўнародных сваякоў.

Калі ўсынавіцель, у сваю чаргу, эманцыпіраваў усыноўленага, то ён таксама разрываў агнатычны сувязі, якія ўзнікалі паміж імі у выніку ўсынаўлення, і пазбаўляў прыёмнага сына або дачку права наследаваць. У той жа час, пасля эманцыпацыі прыёмным бацькам ўсыноўлены ізноў набываў статус эманцыпаванага дзіцёнка ў адносінах да ягонага кроўнага бацькі, што рабіла яго, згодна з прэтарскім заканадаўствам, нашчадкам кроўнага бацькі ў першым класе (нароўні з *sui heredes*).

**Візантыя**

Эвалюцыя інстытута ўсынаўлення ва Усходняй Рымскай імперыі адбывалася ў кантэксце далейшага развіцця рымкага права [5; 6; 7]. Апроч захавання ўплыву сям’і ў грамадстве, важнай функцыяй усынаўлення ў Візантыі стала задавальненне душэўна-эмацыйных патрэбаў тых, хто ўсынаўляў, іх імкнення набыць спадчынніка, знайсці «суцяшэнне» на старасці.

Візантыйскія імператары звярталіся да ўсынаўлення з палітычнымі мэтамі: каб атрымаць нашчадка або саюзніка, папярэдзіць змову і г.д. Асабліва распаўсюдзілася гэтая практыка ў XI ст. Далей за іншых васілеўсаў пайшоў Аляксей I Камнін (1081–1118), які ўсынаўляў чужаземцаў. Напрыклад, увесну 1097 г. ён усынавіў правадыроў Першага крыжовага пахода з мэтай дамагчыся ад іх большай лаяльнасці [8, p. 81–82, 108–113].

Пад уплывам хрысціянства атрымала распаўсюджанне ўсынаўленне як дабрачынны акт: звычайна такім чынам усынаўлялі бедную дзяўчынку, якую потым забяспечвалі пасагам і выдавалі замуж. Такое ўсынаўленне, аднак, не рабіла прыёмнага дзіцёнка нашчадкам усынавіцеля або прадаўжальнікам ягонага роду.

Пад час кіравання Юстыніяна (527–565) яшчэ існаваў падзел усынаўлення на *adoptio* і *adrogatio*, але ў далейшым адрозненні паміж імі цалкам нівеліраваліся. Галоўным прынцыпам усынаўлення (υιοθεσία) канчаткова зрабілася «імітацыя прыроды».

Звычайна ўсынаўленне праходзіла ў судзе або перад мясцовай адміністрацыяй. У навэлах Льва VI Мудрага (886–912) згадваецца яшчэ адзін від усынаўлення – праз царкоўнае блаславенне. Падчас гэтай цырымоніі прыёмны бацька «прымаў» усынаўляемага з рук святара і абвяшчаў яго сваім сынам: «Ты сын мой; я цяпер нараздіў цябе» (Пс. 2.7). Такім чынам, цырымонія ўсынаўлення збліжалася з цырымоніяй

хросту [9]; гэта праяўлялася таксама ў тым, што ўсыноўленым было забаронена браць шлюб з сіблінгамі з прымаючай сям'і да шостай або сёмай ступені сваяцтва. Але ў цэлым усынаўленне праз царкоўнае блаславенне атрымала шырокае распаўсюджанне толькі ў тэх рэгіёнах, дзе свецкая ўлада страціла свае пазіцыі і ейныя функцыі вымушана была браць на сябе царква.

Юстыніян пацвердзіў дазвол усынаўляць еўнухам-*spadones* і дазволіў удачараць праз *adrogatio*. У часы кіравання Льва VI Мудрага права на ўсынаўленне атрымалі ўсе жанчыны (у тым ліку нявінніцы) і ўсе катэгорыі еўнухаў (у тым ліку καστράτοι і θλιβίαι[4]). Пры гэтым абавязковай была мінімальная розніца ва ўзросце паміж прыёмнымі бацькамі і дзецьмі – 18 гадоў. Забаранялася ўсынаўляць чалавека, якога раней ужо ўсынавілі, некалькі чалавек, уласных незаконнароджаных дзяцей.

Той, каго ўсынаўлялі, пераходзіў пад уладу свайго прыёмнага бацькі толькі ў выпадку, калі паміж імі існавала кагнатычная роднасць (напрыклад, яны былі дзедам і ўнукам). Такое ўсынаўленне называлася поўным (*adoptio plena*). У адваротным выпадку (*adoptio minus plena*) ўсыноўлены захоўваў пераемнасць са сваёй сям'ёй па пахожданню і працягваў знаходзіцца пад бацькоўскай уладай[5] роднага бацькі.

Закон прызнаваў за ўсыноўленым права наследаваць усынавіцелю, калі той паміраў без тэстаменту. Юстыніян пастанавіў, што ў выпадку ўсынаўлення праз *adrogatio* да ўсынавіцеля пераходзіла не права ўласнасці на маёмасць усыноўленага, але толькі права карыстацца маёмасцю як узуфруктам [10, p. 24–26, 119–120].

Пачынаючы з XIII ст. шырокае распаўсюджанне атрымоўваюць дамовы аб усынаўленні, хоць практыка іх заключэння ўзыходзіць, як можна лічыць, да VII ст. У гэтых дамовах агаворваліся наступныя аспекты: матэрыяльнае забеспячэнне ўсыноўленага; права ўсыноўленага на спадчыну; санкцыі ў тым выпадку, калі ўсыноўлены пакідаў сваіх прыёмных бацькоў (ён губляў права спадчыны) або яны самі адмаўляліся ад яго (ўсыноўлены атрымліваў 1/12 спадчыны); абавязак ўсыноўленага клапаціцца пра сваіх прыёмных бацькоў.

**Заходняя Еўропа**

Пра ўсынаўленне ў Раннім Сярэднявеччы вядома няшмат. Гэта тлумачыцца як параўнальна малым аб'ёмам інфармацыі, што дайшла да

---

[4] Καστράτος абазначае мужчыну, які страціў свае геніталіі і, значна радзей, пеніс праз адразанне, а θλιβίας — мужчыну, які страціў геніталіі праз здаўленне. Падзрабязней гл.: [4].

[5] Відавочна, што ў дадзеным выпадку «бацькоўская ўлада» – гэта не тое ж самае, што старажытнырымская *patria potestas*.

нас з тых часоў, так і тым, што ў варварскіх грамадствах шэраг сацыяльных функцый, уласцівых усынаўленню, выконвалі ішныя інстытуты: афатамія, *adoptio in hereditatem, donatio post obitum* [11]. Што тычыцца тэзісу аб тым, што Каталіцкая царква не ўхваляла ўсынаўленне, таму што бяздзетныя парафіяне ахвотней завяшчалі ёй сваю маёмасць [12, p. 40–47], то ён быў абвергнуты [13, p. 44–46; 14, p. 193–195]. Пачынаючы з XII ст. пытанні, якія былі звязаныя з усынаўленнем, пачалі актыўна распрацоўвацца гласатарамі і кананістамі, якія адаптавалі класічнае рымскае права да тагачасных патрэбаў грамадства [13; 14, p. 179–195; 15, p. 51–75].

Як і ў Старажытным Рыме, на лацінскім Захадзе існавалі дзве асноўныя формы ўсынаўлення: *adoptio* і *adrogatio*. Амерыканскі даследчык кананічнага права Чарльз Рыд вылучае таксама "informal adoption", якое атрымала найбольшае распаўсюджанне ў Раннім Сярэднявеччы. Калі хто-небудзь знаходзіў пакінутага дзіцёнка і калі цягам вызначанага часу бацькі не заяўлялі сваі правы на яго, той, хто знайшоў дзіцёнка, мог пакінуць яго сабе і гадаваць як свайго [14, p. 183–185].

Звычайна ўсынавіцель павінен быў быць бяздзетным[6], але без відавочнай няздольнасці спарадзіць дзяцей. Розніца ва ўзросце паміж усынавіцелем і ўсыноўленым звычайна павінна была скаладаць не менш чым 18 гадоў. У адрозненні ад Візантыі, на лацінскім Захадзе еўнухі і жанчыны не маглі быць усынавіцелямі. У выключных выпадках дазвалялася ўсынаўляць жанчыне, якая страціла ўсіх дзяцей у выніку вайны або па рэлігійных прычынах (напрыклад, сыход у кляштар).

Падчас цырымоніі ўсынаўлення праз *adrogatio* той, каго ўсынаўлялі, павінен быў выказаць згоду на ўсынаўленне (пры *adoptio* гэта павінен быў зрабіць кроўны бацька). Пасля гэтага ўсынавіцель вымаўляў рытуальную формулу аб тым, што прымае яго як свайго сына. Пры гэтым прысутнічаў прадстаўнік улады (звычайна суддзя), які замацоўваў вынікі цырымоніі як *actus legitimus*. Напраклад, у Балоны ўсынаўленне праз *adoptio* праводзілася ў прысутнасці суддзі і асэсара гарадскога падэсты, а усынаўленне праз *adrogatio* – ў прысутнасці *ordinarius* германскага імператара.

Пры *adoptio* ўсыноўлены пераходзіў *in filiatione* прыёмнага бацькі, то бок, лічыўся ягоным сынам. Пры гэтым, аднак, ён працягваў знаходзіцца пад бацькоўскай уладай свайго роднага бацькі і захоўваў

[6] Зрэшты, шмат хто з гласатараў не лічыў наяўнасць дзяцей у патэнцыйнага прыёмнага бацькі перашкодай таму, каб той мог усынаўляць.

права наследаваць яму. Адначасова ён мог наследаваць свайму прыёмнаму бацьку, калі той памiраў без тэстаменту. Пры *adrogatio* ўсыноўлены пераходзiў не толькi *in filiatione*, але таксама, калi выкарыстоўваць тэрмiналогiю першакрынiц, *in familia, in potestate, in iure, in disciplina* ўсынавiцеля, то бок цалкам падпарадкоўваўся ягонай бацькоўскай уладзе[7]. Адпаведна, ён не толькi наследваў прыёмнаму бацьку, калi той памiраў без тэстаменту, але таксама меў права на частку ў так званай «Фальцыдыевай чвэрцi»[8] ў выпадку, калi прыёмны бацька эманцыпiраваў яго. Можна казаць, што ўсыноўлены праз *adrogatio* атрымлiваў частковыя натуральныя правы, падобныя да тых, што былi ў бiялагiчных дзяцей усынавiцеля [14, p. 192–193]. Па гэтай прычыне ў сярэднявечных юрыдычных трактатах *adrogatio* можа пазначацца як *adoptio plena*, а ўласна *adoptio* – як *adoptio minus plena*.

Часта ўсынаўленне суправаджалася заключэннем дамовы, у якой пазначалiся абавязкi ўсынавiцеля i ўсыноўленага адзiн да аднаго i санкцыi за iх парушэнне. Такiя дамовы заключалiся яшчэ ў часы Меравiнгаў, хоць у найбольш ранніх формулах з тых, што дайшлi да нас, апiсваецца працэдура не ўласна ўсынаўлення, а хутчэй *adoptio in hereditatem* [13, p. 37].

Разглядаючы ўсынаўленне як «iмiтацыю прыроды» (*naturae similitudo, imitatio naturae*) [17], большасць юрыстаў адзначаюць, што яно не стварае кроўных сувязей, але толькi iмiтуе iх настолькi поўна, наколькi гэта магчыма. Праз юрыдычныя трактаты чырвонай нiткай праходзiць думка аб тым, што прыёмны сын нiколi не будзе роўны кроўнаму: розніца памiж iмi ў тым, што прыёмныя дзецi лiчацца *legitimi*, а кроўныя — *legitimi et naturales*. Адсюль, прынамсi, вынiкала прызнанне выключнага права або (ў некаторых выпадках) першынства кроўных дзяцей перад прыёмнымi ў атрыманнi ў спадчыну феодаў.

**Высновы**

Змены, якiя адбывалiся з iнстытутам усынаўлення ў Антычнасцi i Сярэднявеччы, былi выклiканы шэрагам фактараў: памяншэннем значэння агнатычнай роднасцi i, адпаведна, павелiчэннем значэння роднасцi кагнатычнай; зменамi ў адносiнах людзей да сям'i i дзяцей; хрысцiянiзацыяй грамадства i iнш.

---

[7] Калi ўсынавiцель быў блiзкiм кроўным сваяком (напрыклад, дзедам) усыноўленага, апошнi аўтаматычна пераходзiў пад ягоную бацькоўскую ўладу.

[8] «Фальцыдыевая чвэрць» – мiнiмальная гарантаваная частка маёмасцi памерлага (¼ частка), якая адыходзiла да ягоных нашчадкаў па тэстаменту, калi спадчынадавец адмаўляў iм у спадчыне на выпадак сваёй смерцi на карысць iншых чальцоў сям'i, якiя не згадвалiся ў тэстаменце, або iншых людзей, якiя не з'яўлялiся чальцамi сям'i. Падрабязней гл.: [16].

Ужо ў эпоху Рымскай імперыі пачалося паступовае зліццё двух відаў усынаўлення (*adoptio* і *adrogatio*) у адзін. У Візантыі гэты працэс завяршыўся ў Раннім Сярэднявеччы; у Заходняй Еўропе падзел на *adoptio* і *adrogatio* фармальна захаваўся, хоць адрозненні паміж імі былі нязначнымі. У дадатак да грамадзянскай цырымоніі ўсынаўлення ў Візантыі пад уплывам цырымоніі хросту ўзнікла ўсынаўленне праз царкоўнае блаславенне.

Ва ўсе эпохі ад усынавіцеля патрабавалася быць дарослай дзеяздольнай асобай. Ужо ў Старажытным Рыме спіс асобаў, якім дазвалялася ўсынаўляць, пачаў пашырацца; ён канчаткова ахапіў усіх мужчын і жанчын ужо ў Візантыі. Наадварот, у Заходняй Еўропе, дзе асаблівае значэнне надавалася прынцыпу "імітацыі прыроды", адбылося частковае вяртанне да старых рымскіх практык, што праявілася ў забароне ўсынаўляць жанчынам і еўнухам.

Аднак галоўныя змены, якія адбываліся цягам часу, датычыліся самой сутнасці інстытута ўсынаўлення. У Старажытным Рыме ўсынаўленне юрыдычна замацоўвала прыёмнага сына або дачку пад *patria potestas* галавы сям'і. У Візантыі і ў Заходняй Еўропе яно павінна было ствараць паміж усынавіцелем і ўсыноўленым асабістыя сувязі накшталт тых, якія існавалі паміж бацькам і ягоным кроўным дзіцём. У асобных выпадках ўсыноўлены нават атрымліваў частковыя натуральныя правы ў дачыненні да свайго прыёмнага бацькі. Адначасова з гэтым усыноўлены захоўваў правы ў дачыненні да сваёй сям'і па паходжанню. Гэта дазваляе прыйсці да высновы, што з цягам часу інстытут усынаўлення пачаў арыентавацца больш на абарону правоў усыноўленага, чым усынавіцеля.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Санфилиппо Ч. Курс римского частного права / пер. с итал. И.И. Маханькова; под ред. Д.В. Дождева. Москва: Норма, 2017.
2. Lindsay H. Adoption in the Roman World. Cambridge: Cambridge University Press, 2009.
3. Ширвиндт А.М. Значение фикции в римском праве на примере формулы усыновления (*adrogatio*) // Вестник древней истории. 2011. № 3. С. 156–173.
4. Kontani Yu. Castration under Roman Law: A Study of the Codification during the Reign of Justinian I (527–565) // Ancient Society. 2018. Vol. 48. P. 305–331.
5. Соколов И.И. Усыновление и его отношение к браку в Византии и на современном греческом Востоке: историко-правовой очерк. Санкт-Петербург: Синодальная типография, 1910.
6. Macrides R.J. Kinship by Arrangement: The Case of Adoption // Dumbarton Oaks Papers. 1990. Vol. 44. P. 109–118. DOI: 10.2307/1291621.
7. Pitsakis C. *G.* L'adoption dans le droit byzantin // Médiévales. 1998. № 35. P. 19–32. DOI: 10.3406/medi.1998.1426.

8. Shepard J. ‘Father’ or ‘scorpion’? Style and substance in Alexios’s diplomacy // Alexios I Komnenos / ed. M. Mullet, D. Smythe. Vol. 1: Papers. Belfast, 1996. P. 68–132.

9. Patlagean E. Christianisation et parentés rituelles: le domaine de Byzance // Annales. Économies, Sociétés, Civilisations. 33e année. 1978. № 3. P. 625–636. DOI: 10.3406/ahess.1978.293954.

10. A Companion to Justinian’s Institutes / ed. E. Metzger. Ithaca; New York: Duckworth, 1998.

11. Santinelli E. Continuité ou rupture? L’adoption dans le droit mérovingien // Médiévales. 1998. № 35. P. 9–18. DOI: 10.3406/medi.1998.1425.

12. Gager K.E. Blood Ties and Fictive Ties: Adoption and Family Life in Early Modern France. Princeton: Princeton University Press, 1996.

13. Guerreau-Jalabert A. Qu’est-ce que l’adoptio dans la société chrétienne médiévale? // Médiévales. 1998. № 35. P. 33–49. DOI: 10.3406/medi.1998.1427.

14. Reid C.J., Jr. Power over the Body, Equality in the Family: Rights and Domestic Relations in Medieval Canon Law. Grand Rapids; Cambridge: Eerdmans, 2004.

15. Di Renzo Villata M.G. Adoption Between *Ancien Régime* and Codification: Is It in Remission in a Changing World? // Family Law and Society in Europe from the Middle Ages to the Contemporary Era / ed. M. G. Di Renzo Villata. Springer, 2016. P. 51–92. DOI:10.1007/978-3-319-42289-3_3.

16. Копылов А.В. О законе Фальцидия в праве Древнего Рима // История государства и права. 2020. № 1. С. 38–44. DOI: 10.18572/1812-3805-2020-1-38-44.

17. Roumy F. *Adoptio naturam imitatur*: Étendue et portée d’une maxime aristotélicienne dans la pensée juridique médiévale (XII$^{e}$–XV$^{e}$ siècles) // Médiévales. 1998. № 35. P. 51–60. DOI: 10.3406/medi.1998.1428.